ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

№ 6(980) | ЧАЦВЕР, 13 красавіка 2000 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

Чарговае пасяджэнне Савета універсітэта, якое адбылося 30 сакавіка, пачалося з прыемнай працэдуры — узнагароджання дыпломамі і граматамі лаўрэатаў і дыпламантаў універсітэцкага конкурсу на лепшы падручнік і лепшы вучэбна-метадычны дапаможнік.

Старшыня прафкома ГДУ Г.І.Варатніцкі далажыў членам Савета аб выкананні калектыўнага дагавора за 1999 год, з дапаўненнямі выступіла старшыня прафкома студэнтаў Н.І.Колтышава. У абмеркаванні пытання прыняў удзел рэктар ГДУ прафеср М.В.Селькін.

Справаздачу аб рабоце камітэта БПСМ універсітэта зрабіў намеснік сакратара камітэта Беларускага патрыятычнага саюза моладзі студэнт 3 курса фізічнага факультэта П.Кавалёў.

Дырэктар прадпрыемства грамадскага харчавання Т.М.Соціева асвятліла пытанне аб арганізацыі харчавання студэнтаў у сталовай і буфетах універсітэта.

З інфармацыяй аб прадстаўленні дзеячоў навукі, адукацыі, а таксама таленавітых маладых вучоных да назначэння стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь выступіў прарэктар па навуковай рабоце прафесар Д.Р.Лін.

Рашэннем Савета ўнесены змяненні ў Палажэнне аб матэрыяльным стымуляванні і Палажэнне аб аказанні матэрыяльнай дапамогі, з якімі членаў Савета азнаёмілі начальнік планава-фінансавага аддзела С.Я.Пашук і начальнік НДС В.Р.Сафонаў.

Савет прыняў рашэнне хадайнічаць перад ВАКам аб прысваенні вучонага звання дацэнта В.У.Свірыдавай, М.П.Купрэеву з кафедры агульнай фізікі і І.У.Сільчанка з кафедры псіхалогіі па адпаведных спецыяльнасцях.

На вакантныя пасады па конкурсу ст.выкладчыкамі кафедры фізвыхавання і спорту абраны В.З.Марчанка, Г.С.Галаунёва, С.Б.Пірагоў.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За дасягнутыя поспехі ў навучанні і выхаванні падрастаючага пакалення выкладчыца кафедры нямецкай мовы **МАКУШЫНСКАЯ** Тамара Рыгораўна ўзнагароджана Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

***

За шматгадовую плённую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння загадчык кафедры беларускай культуры дацэнт **ПАЎЛАВЕЦ** Дзмітрый Дзмітрыевіч узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.

## МЭТА ДАСЯГНУТА, А ПЕРСПЕКТЫВЫ ЯШЧЭ ЁСЦЬ

**Падзею, што адбылася ва універсітэце ў канцы сакавіка, па праву можна назваць гістарычнай. Відавочным стаў вынік распачатай сем гадоў таму вялікай справы — арганізацыі і адкрыцця на аснове дагавораў аб супрацоўніцтве паміж ГДУ імя Ф.Скарыны і Універсітэтам Овернь Клермон-Феран-1 сумеснага Франка-Беларускага інстытута кіравання, у якім адбыўся першы выпуск спецыялістаў з уручэннем ім дыпломаў аб вышэйшай адукацыі Maîtrise.**

Аб тым, якім быў шлях да гэтага знамянальнага дня, узгадалі ў час урачыстага ўручэння дыпломаў, што адбылося ў актавай зале ГДУ, сённяшні і былы рэктары універсітэта М.В.Селькін і Л.А.Шамяткоў, старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў В.С.Сяліцкі і віцэ-прэзідэнт Універсітэта Клермон-Феран-1, садырэктар ФБІК з французскага боку прафесар Морыс Шэневуа. Колькі тысяч кіламетраў пераадолеў апошні за рулём уласнай аўтамашыны разам са сваімі французскімі калегамі — ад роднага Клермон-Ферана да далёкага беларускага горада Гомеля, куды за ўсе гэтыя сем гадоў ён прыязджаў 37 разоў!.. Дзякуючы яго вялікаму энтузіязму, невычэрпнай энергіі, а таксама сумеснай з нашым кіраўніцтвам веры ў поспех гэтага пачынання, пры падтрымцы Міністэрства замежных спраў Францыі, пасольства Францыі ў Мінску і Міністэрства адукацыі Беларусі ажыццявіўся гэты ўнікальны праект. Упершыню ў краінах СНД была створана сумесная вну, якая вядзе падрыхтоўку кіруючага персаналу для беларускіх і сумесных з замежжам прадпрыемстваў, і выпускнікі якой атрымліваюць адразу два раўназначныя дыпломы аб вышэйшай адукацыі — ГДУ і ФБІК.



На здымку: садырэктар Франка-Беларускага інстытута кіравання, віцэ-прэзідэнт Універсітэта Клермон-Феран-1 М.Шэневуа ўручае дыплом DEUG Дзянісу Кавалёву.

Фота У.ЧЫСЦІКА.

— Я адчуваю сябе шчаслівым, што задуманае здзейснілася, — зазначыў у сваім выступленні М.Шэневуа. — Сфарміраваны кантынгент студэнтаў, якія пазнаёміліся з сучаснымі метадамі кіравання на прадпрыемстве. Перад імі раскрыліся шырокія магчымасці ў прафесійнай дзейнасці, яны шмат змогуць зрабіць для развіцця эканомікі Беларусі, а таксама пашырэння адносін паміж нашымі краінамі.

І вось наступае самы хвалюючы момант. На сцэну выклікаюцца студэнты ФБІК розных курсаў навучання для ўручэння ім адпаведных дыпломаў. Неабходна ўдакладніць, што вучэбны план сумеснай міждзяржаўнай вну прадугледжвае трохразовую выдачу студэнту дыпломаў пасля трох, чатырох і пяці гадоў навучання, як гэта робіцца ў Францыі: дыплом аб агульнауніверсітэцкай падрыхтоўцы (DEUG), дыплом аб ступені ліцэнцыята (Licence) і дыплом аб вышэйшай адукацыі (Maîtrise). Юнакі і дзяўчаты, якія вучацца паралельна ў ФБІК і на эканамічным, юрыдычным факультэтах ГДУ, і акрамя спецыяльных ведаў авалодалі дасканала французскай мовай, атрымлівалі названыя дыпломы ў залежнасці ад курса навучання. У іх адрас гучалі цёплыя словы віншаванняў. Ва ўрачыстасці прыняў удзел старшыня Гомельскага гарвыканкома А.С.Якабсон.

Сумесны Франка-Беларускі інстытут кіравання будзе і далей развівацца і ўдасканальвацца, каб яго выпускнікі змаглі яшчэ больш паспяхова працаваць як на карысць дабрабыту сваёй краіны, так і пашырэння супрацоўніцтва з Францыяй, іншымі замежнымі партнёрамі.

Т.ДУБЯК.

## ЛЕПШЫЯ ПАДРУЧНІКІ І ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫЯ ДАПАМОЖНІКІ

Падведзены вынікі II тура конкурсу на лепшыя падручнік і вучэбна-метадычны дапаможнік, якія былі выдадзены ў 1997-1998гг. і прайшлі апрабацыю на працягу не менш аднаго года.

Для ўдзелу ў ім было прадстаўлена 17 выданняў, рэкамендаваных метадычнымі саветамі факультэтаў і кафедр універсітэта, па наступных профілях: прыродазнаўча-навуковы, гуманітарны, педагагічны, эканамічны.

**Лаўрэатамі універсітэцкага конкурсу па рашэнню журы сталі наступныя аўтары:**

**У.У.Сыцько**, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар кафедры оптыкі — за вучэбны дапаможнік "Тэарэтычная метралогія";

**Л.М.Сапегін**, доктар біялагічных навук, прафесар кафедры батанікі і фізіялогіі раслін — за вучэбны дапаможнік "Батаніка. Сістэматыка вышэйшых раслін";

**М.В.Навучыцель**, доктар эканамічных навук, прафесар, **Б.У.Сарвіраў**, к.э.н., дацэнт, загадчык кафедры эканамічных тэорый, **В.А.Мінчанка**, к.э.н., дацэнт кафедры бухуліку, кантролю і АГД — за вучэбны дапаможнік "Бюджэтныя і падатковыя сістэмы замежных краін";

**У.М.Калмыкоў**, доктар філасофскіх навук, прафесар, загадчык кафедры філасофіі — за вучэбны дапаможнік "Асновы філасофіі";

**М.В.Навучыцель**, д.э.н., прафесар — за вучэбны дапаможнік "Развіццё эканамічнай тэорыі ў XX стагоддзі";

**Ф.У.Кадол**, к.п.н., дацэнт кафедры педагогікі — за вучэбны дапаможнік "Выхаванне гонару і годнасці старшакласнікаў".

**Дыпламантамі конкурсу прызнаны** :

**І.В.Семчанка**, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, загадчык кафедры агульнай фізікі — за вучэбны дапаможнік "Асновы электрамагнетызму";

**І.В.Максімей**, доктар тэхнічных навук, прафесар, загадчык кафедры МПК, **Н.Б.Асіпенка**, к.ф.-м.н., дацэнт кафедры МПК — за дапаможнік для лабараторных работ па спецкурсу "Апрацоўка эксперыментальных дадзеных на ЭВМ";

**І.Ф.Расашка**, к.б.н., дацэнт, загадчык кафедры заалогіі і аховы прыроды, **В.І.Талкачоў**, к.б.н., дацэнт кафедры заалогіі і аховы прыроды — за вучэбны дапаможнік "Агульная біялогія";

**М.М.Воінаў**, к.ф.н., дацэнт, **В.І.Смыкоўская**, к.ф.н., дацэнт кафедры беларускай літаратуры — за дапаможнік "Вучыць і выхоўваць словам";

**Я.Я.Вяршыгара**, к.э.н., дацэнт кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю — за вучэбны дапаможнік "Менеджмент";

**І.В.Сільчанка**, к.п.н., дацэнт кафедры псіхалогіі — за вучэбны дапаможнік "Уводзіны ў тэорыю псіхадрамы".

На пасяджэнні Савета універсітэта лаўрэатам конкурсу ўручаны дыпломы, а дыпламантам — Ганаровыя граматы. Яны заахвочаны таксама грашовымі прэміямі.

## АБ ВЫКАНАННІ КАЛЕКТЫЎНАГА ДАГАВОРА

Як адзначыў у сваім выступленні на Савеце універсітэта старшыня прафкома Г.І.Варатніцкі, усе асноўныя раздзелы гэтага галоўнага нарматыўнага дакумента, які рэгулюе працоўныя і сацыяльна-эканамічныя адносіны паміж адміністрацыяй і работнікамі ГДУ, у 1998-99 гг. выконваліся. Што ж датычыць Пагаднення па ахове працы, якое ўключала 27 пунктаў, то большая іх палова засталася нявыкананай па прычыне недахопу ва універсітэце матэрыяльных сродкаў, доўгатэрміновай адсутнасці прарэктара па АГР, не належнай меры адказнасці некаторых работнікаў. У вучэбных карпусах і інтэрнатах не былі праведзены запланаваныя рамонтныя работы, не ўсе супрацоўнікі ГДУ, якія працуюць у шкодных умовах, прайшлі медагляд, на факультэтах і ў структурных падраздзяленнях не на ўзроўні работа па ахове працы і ТБ. Ёсць і іншыя істотныя недахопы.

Пастаўлена задача выяўленыя ўпушчэнні і пралікі выправіць і не дапускаць іх у далейшым.

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, выкладчыкі і студэнты горача віншуюць **Н.Б.АСІПЕНКА** з кафедры матэматычных праблем кіравання, **С.А.ХАХОМАВА** з кафедры агульнай фізікі і загадчыка кафедры рускай літаратуры **Л.Л.ЕРМАКОВУ** з прысваеннем ім прэзідыумам БелВАКа вучонага звання дацэнт па адпаведных спецыяльнасцях.

МІЖНАРОДНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

## МЭТА — АДЗІНАЯ АГУЛЬНА-АДУКАЦЫЙНАЯ ПРАСТОРА



**На базе МДУ імя М.В.Ламаносава адбылася першая міжнародная канферэнцыя універсітэтаў краін СНД і Балтыі "Універсітэты і грамадства. Супрацоўніцтва універсітэтаў на рубяжы стагоддзяў".**

Пасля развалу СССР сістэма адукацыі кожнай краіны СНД аказалася ізаляванай. Спатрэбілася арганізацыя структуры, якая б дапамагла іх аб'яднаць. Ёй стала створаная ў пачатку 90-х гадоў Еўразійская асацыяцыя універсітэтаў, у якую ўвайшлі 70 універсітэтаў усіх краін СНД і Расіі. Яна ставіць сваімі асноўнымі мэтамі і задачамі: зацвярджэнне прыярытэтаў адукацыі, навукі і культуры як асноўных фактараў сучаснага прагрэсу; арганізацыю міжнароднага супрацоўніцтва універсітэтаў у галіне вучэбна-метадычнай і навукова-даследчай дзейнасці; павышэнне ролі універсітэцкай адукацыі і навукі, пераўтварэнне класічных універсітэтаў у вядучыя вучэбна-навуковыя, культурна-асветніцкія і грамадскія цэнтры краін і рэгіёнаў; абмен вопытам, каардынацыю і арганізацыю сумеснай работы па выпрацоўцы рэкамендацый, накіраваных на развіццё універсітэцкай адукацыі, павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Прыярытэтнай задачай асацыяцыі з'яўляецца захаванне адзінай агульнаадукацыйнай прасторы краін Еўразійскага рэгіёна: аднолькавага ўзроўню патрабаванняў да зместу універсітэцкай адукацыі, эквівалентнасці дыпломаў універсітэтаў.

У склад гэтай асацыяцыі ўваходзіць і Белдзяржуніверсітэт, а наша вну з'яўляецца членам Асацыяцыі прафсаюзных арганізацый класічных універсітэтаў краін СНД.

Удзельнікамі названай канферэнцыі сталі універсітэты — члены Еўразійскай асацыяцыі, а таксама кіраўнікі, вучоныя 15 універсітэтаў краін постсавецкай прасторы.

Беларусь на канферэнцыі прадстаўлялі БДУ, Гродзенскі дзяржуніверсітэт імя Я.Купалы, ГДУ імя Ф.Скарыны, Магілёўскі дзяржуніверсітэт імя А.Куляшова.

Уступным словам канферэнцыю адкрыў і выступіў з дакладам "Універсітэты. Сучаснасць. Будучыня" рэктар МДУ імя М.В.Ламаносава, прэзідэнт Еўразійскай асацыяцыі універсітэтаў акадэмік РАН В.А.Садаўнічы. Ён адзначыў, што ў складаны час пераўтварэнняў і перамен асабліва важна аб'яднанне намаганняў універсітэтаў у імя высокіх мэт развіцця адукацыі і навукі, разуменне таго, што гэта — аснова прагрэсу нашых краін і народаў.

На пленарным і пяці секцыйных пасяджэннях, у рабоце якіх прынялі ўдзел звыш 800 чалавек, заслухана каля 200 дакладаў. У іх уздымаліся ключавыя праблемы супрацоўніцтва, меры і дзеянні па фарміраванню адзінай агульнаадукацыйнай і навуковай прасторы краін СНД, супрацоўніцтва з універсітэтамі Балтыі, усёй сусветнай універсітэцкай супольнасцю.

У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел дэкан гістарычнага факультэта ГДУ М.І.Старавойтаў, старшыня прафкома Г.І.Варатніцкі, старшыня прафкома студэнтаў Н.І.Колтышава, якія адпаведна працавалі ў секцыях "Класічныя універсітэты — цэнтры адукацыі,навукі і культуры" і "Сацыяльна-працоўныя адносіны ва універсітэтах".

**Т.НІКАЛАЕВА.**

## НОВАЯ СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫЯ — ЛІТАРАТУРНЫ РАБОТНІК

З новага навучальнага года ва універсітэце будзе весціся падрыхтоўка літаратурных работнікаў. Па ёй будуць навучацца 20 студэнтаў аддзялення беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта.

Выпускнікі будуць накіроўвацца на работу ў сродкі масавай інфармацыі Гомельшчыны.

Вниманию абитуриентов -- 2000

## В ВУЗ — ПО НОВЫМ ПРАВИЛАМ

**В конце минувшего года по распоряжению Президента страны правила приема в вузы стали предметом пристального внимания специальной комиссии, в состав которой вошли ректоры высших учебных заведений республики, директора школ, представители Комитета государственного контроля, Министерства и областных управлений образования, Министерства юстиции. Выводы и предложения комиссии, возглавляемой первым заместителем министра образования Б.М.Хрусталевым, стали основой утвержденного нового порядка приема в вузы. О том, какие новшества грядут нынче и в перспективе, корреспонденту "Советской Белоруссии" рассказал заместитель начальника главного управления высшего и среднего специального образования Министерства образования республики Бронислав ДАШКЕВИЧ.**

— Если говорить о перспективах, то они связаны с разработкой концепции приема в высшие и средние специальные учебные заведения страны на 2001 и последующие годы. В ней отражены современные тенденции в получении высшего образования. К примеру, в этом году знания абитуриентов будут оцениваться по шестибалльной системе, а в будущем — по десятибалльной. Намечается переход к централизованной подготовке экзаменационных материалов по всем предметам. Чтобы свести к минимуму возможные злоупотребления, один и тот же экзамен будет проводиться одновременно во всех вузах страны.

**— А на сегодняшний день, пожалуй, один из самых больных вопросов — льготы для поступающих.**

— Льгот столько, что у обычного школьника, не имеющего особых заслуг, кроме хороших знаний, шансов поступить в вуз с каждым годом все меньше. Ну взять хотя бы медалистов. В мировой практике для них не существует никаких скидок при поступлении. Медаль — это награда за отличную учебу в школе. А право на студенческий билет надо доказать. Именно потому в этом году медалистам предстоит сдавать как минимум один экзамен, а, скажем, в БГПА или Минский лингвистический университет — все. Без экзаменов в оба этих вуза будут зачислены победители международных и республиканских олимпиад, лауреаты специальных фондов Президента Республики Беларусь. При поступлении же в иные вузы победителям и лауреатам выставляется оценка "пять" по соответствующему предмету. Хотел бы обратить внимание еще на один момент. Правом внеконкурсного зачисления пользуются белорусы зарубежья, поступающие в вузы республики по рекомендациям белорусских общественных организаций.

**— Бронислав Викторович, особую обеспокоенность вузовских экзаменаторов вызывает все увеличивающийся разрыв в уровне знаний городских и сельских ребят.**

— Решать эту проблему можно либо снижая планку требований к абитуриентам из села, либо расширяя сеть классов довузовской подготовки, максимально используя для этого учебную базу райцентров. Мы остановились на втором варианте. Есть для них и небольшая скидка: в этом году выпускники лицейских классов сельских школ могут быть зачислены на 1-й курс (до 20 процентов от плана набора на конкретную специальность) по итогам совмещенных выпускных и вступительных экзаменов. Если же конкретный вуз решит ввести для них дополнительные льготы — это его право.

**— А как же городские лицеисты и выпускники гимназий?**

— Для них, как и для выпускников подготовительных отделений, совмещенные экзамены с 2001 года будут отменены. Нынче же проведение совмещенных экзаменов возможно, если высшее учебное заведение обоснует их необходимость.

**— Какова судьба централизованного тестирования?**

— Оно пройдет в апреле в Белорусской государственной политехнической академии, Брестском политехническом институте, Витебском государственном технологическом университете, Гомельском государственном техническом университете, Гродненском государственном университете, Могилевском машиностроительном институте. Хочу подчеркнуть: тестирование — дело сугубо добровольное и платное. Результаты тестов действительны на всей территории республики и при желании абитуриента должны быть зачтены в качестве оценки на вступительных экзаменах при поступлении на любую техническую специальность (если результат не устраивает, вы имеете право его не предъявлять, попытать счастья на экзаменах). Учитывать ли их при поступлении на другие специальности, решает вуз. Централизованное тестирование, которое давно уже используется в мировой практике, — очень перспективная вещь, в будущем оно заменит вступительные экзамены.

**— Изменились ли условия целевой контрактной подготовки?**

— Положение о целевой контрактной подготовке переработано. Как правило, претендовать на контракт могут те, кто по профильным предметам вступительных экзаменов имеет в аттестате оценки "четыре" и "пять". Целевая контрактная подготовка не распространяется на предприятия и организации, расположенные в Минске, областных центрах, городах областного подчинения. Количество направлений на конкретное целевое место не ограничено. Конкретизирована ответственность сторон за несоблюдение договорных обязательств. Предприятие-заказчик, не пожелавшее обеспечить молодому специалисту оговоренные в контракте условия работы, равно как и выпускник вуза, отказавшийся отработать оговоренный в контракте срок, обязаны возместить стоимость обучения за пять лет - это в среднем 300-800 условных единиц в год.

**— Будет ли увеличен план приема?**

— К сожалению, нет. В последние годы цифры приема остаются стабильными — около 25.000 бюджетных мест для обучения на дневных отделениях. Происходит только перераспределение этих мест между вузами и специальностями в зависимости от потребности в кадрах. Более того, в этом году поступило предложение сократить набор в вузы, подведомственные Министерству образования, на 125 человек, чтобы увеличить набор в мединституты. Мне кажется, это не лучший вариант. Наши вузы и без того не полностью обеспечивают специалистами предприятия и учреждения. Хотелось бы, чтоб республиканский межведомственный совет по трудоустройству и профессиональной подготовке молодежи внимательно рассмотрел этот вопрос.

**— Сколько вступительных экзаменов в этом году предстоит абитуриентам?**

— Это определяют сами вузы с учетом профиля и требований образовательного стандарта по каждой специальности. Точно могу сказать одно: увеличится количество письменных экзаменов, особенно по специальностям, на которые в предыдущие годы был высокий конкурс.

**— Не первый год говорят о дисбалансе школьных программ и экзаменационных требований. Когда он будет устранен?**

— Мы проанализировали программы вступительных экзаменов, внесли необходимые изменения, и в настоящее время дисбаланса не существует. Другой вопрос, что одну и ту же задачу можно сформулировать по-разному: с "изюминкой" и без. Так вот задачи с "изюминкой" на вступительных экзаменах будут обязательно. И ребятам, и родителям не стоит сбрасывать со счетов то, что абитуриенты нынче очень сильные. А потому лучше рассчитывать не на легкий билет, а на собственные знания.

**Галина ТОРОПЕЦКАЯ, "СБ".**

Кадры новага стагоддзя

## У САЮЗЕ НАВУКІ І ПРАКТЫКІ

**Выпускнікі некалькіх факультэтаў нашага універсітэта плённа працуюць на розных пасадах ВА "Беларусьнафта". Гэтае вытворчае аб'яднанне падтрымлівае і цесныя навуковыя сувязі з вядучай вышэйшай навучальнай установай Беларускага Палесся. Важную ролю тут адыгрывае геолага-геаграфічны факультэт. Аб перспектывах двухбаковага супрацоўніцтва мы папрасілі расказаць дэкана названага факультэта кандыдата геолага-мінералагічных навук, дацэнта Г.А. СЕРБІНА.**

— Сёлета, — сказаў Георгій Анатольевіч, — з новага навучальнага года на нашым факультэце прадугледжваецца адкрыць новую спецыялізацыю "Геалогія і разведка нафтавых і газавых месцанараджэнняў". Прыняць такое рашэнне, даволі рэдкаснае ў цяперашні час, выклікана заяўкай ВА "Беларусьнафта" на падрыхтоўку маладых спецыялістаў да 2010 года, згодна якой ужо ў бягучым годзе наш факультэт пачне накіроўваць у аб'яднанне сваіх выпускнікоў са спецыялізацыяй па геафізічных метадах пошуку і разведкі карысных выкапняў. Бо без пашырэння пошукава-разведачных работ нельга павялічыць аб'ём здабычы беларускага "чорнага золата".

Гэта — галоўнае. А па-другое, нам трэба сумесна клапаціцца і аб амаладжэнні кадраў з вышэйшай геалагічнай адукацыяй. Трэба, каб працэс іх абнаўлення праходзіў не абвальна і не вельмі балюча для вытворчасці.

Пагадзіцеся, калі геафізік яшчэ і не дасягнуў пенсійнага ўзросту, але адпрацаваў ужо 30-35 гадоў, яго не пашлеш у поле, каб ён зноў пераадольваў сотні кіламетраў, як гэта рабіў у маладосці.

Наш факультэт — адзіны ў рэспубліцы, які рыхтуе спецыялістаў такога профілю. Вывучаючы патрэбу ў іх, мы прыйшлі да вываду, што яны будуць запатрабаваны многімі геалагічнымі арганізацыямі. Але ж галоўным заказчыкам па-ранейшаму застаецца ўсё тое ж ВА "Беларусьнафта".

Такім чынам, асноўны навуковы і вытворчы патэнцыял сканцэнтраваны ў нашым рэгіёне. Таму, як кажуць, сам Бог пажадаў нам пашыраць і ўзмацняць узаемавыгадныя сувязі паміж ГДУ і беларускімі нафтавікамі.

На падставе сказанага ўзнікае крайняя неабходнасць адкрыцця на базе аб'яднання філіяла кафедры, дзе з удзелам практыкаў будзе больш грунтоўна і якасна весціся падрыхтоўка маладых спецыялістаў. Адкрыццё новай спецыялізацыі дазволіць аб'яднанню накіроўваць на вучобу ва універсітэт сваіх абітурыентаў з ліку найбольш падрыхтаваных маладых рабочых, якія затым вернуцца на вытворчасць ужо дыпламаванымі спецыялістамі. Адначасова прадставіцца магчымасць ажыццяўляць павышэнне кваліфікацыі наяўных кадраў.

У выпадку адкрыцця філіяла кафедры ў яго штат будуць залічаны найбольш вопытныя спецыялісты аб'яднання.

--Думаю, — падкрэсліў у заключэнне Г.А.Сербін, — што сплаў тэорыі і практыкі станоўча паўздзейнічае на ўвесь вучэбны працэс. Больш таго, студэнты змогуць праходзіць практыку ў структурных падраздзяленнях ВА "Беларусьнафта", выкарыстоўваючы сучаснае абсталяванне. Матэрыяльная база універсітэта, на жаль, такімі тэхнічнымі сродкамі пакуль што не забяспечана. Да таго ж, маючы філіял кафедры, можна праводзіць і сумесныя навуковыя даследаванні.

Геолага-геаграфічны факультэт аднавіў работу некалі існаваўшага нашага філіяла ў Інстытуце геалагічных навук Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь. Але вялікая адлегласць стварае шэраг нязручнасцей, асабліва для студэнтаў-дыпломнікаў. Зусім іншая справа на месцы, у Гомелі. Тут ёсць усе магчымасці для паспяховага вырашэння ўсіх неадкладных пытанняў.

Пагадненне кіраўніцтва універсітэта і ВА "Беларусьнафта" ужо дасягнута. Яго рэалізацыя пачнецца пасля пастаноўкі дакумента на юрыдычную аснову.

ПОЭТИЧЕСКИЕ ДЕБЮТЫ

# И ПУСТЬ "ТОЛПЕ" НЕ ДО ТЕБЯ...

Говорят, что самое страшное неверие — это неверие в себя, свои силы и возможности. Но я считаю, что хуже всего — потерять уверенность в своем таланте. Почему это происходит? Почему люди, умеющие искусно пользоваться пером или кистью, обладающие незаурядными способностями, умением чувствовать прекрасное, любить и ценить красоту искусства, нередко прячут плоды своего таланта "в тумбочку", "под подушку" или более того, просто уничтожают, считая свои творения пустяками. Мол, кому это нужно?

Часто встречаю людей, которые пишут стихи, и неплохие. Говорю: "Надо их показать, напечатать, чтобы все знали". А в ответ слышу: "Зачем? Для кого?" Неужели прав Мережковский:

*Молчи, поэт, молчи,*
*Толпе не до тебя.*
*До скорбных дум твоих кому какое дело?*
*...Ты опоздал, поэт.*

Согласна, уже были Пушкин, Лермонтов, Тютчев... Их время — это время красивой любви, благородных сердец, новых исканий и грез. А мы? Способен ли наш цивилизованный прогрессивный век подарить искусству новых гениальных людей? Или человечество уже XXI века настолько увлечено созданием материальных благ, что о духовных ценностях напрочь забыло? Почему-то замечаю, что люди, просматривая журналы, стараются не обращать внимания на скромные столбики стихов юных поэтов. Чем это можно объяснить? Нехваткой времени, заботами или просто элементарной незаинтересованностью к какой-то лирике.

Так что же все-таки побуждает молодых призывать Муз даже тогда, когда "толпе" нет никакого дела до их творчества? Почему изменилось отношение людей "непишущих" к поэзии?

На эти вопросы я предложила ответить студентам своей группы, среди которых, к моей огромной радости, оказалось немало способных людей. За ними — будущее. Конечно, они не станут Ахматовыми и Есениными. Но, наверное, к этому и не стоит стремиться, ведь настоящий поэт, в первую очередь, индивидуальность. Так давайте поддержим и оценим эти стихи, такие разные, но удивительные уже тем, что они есть, в каждом из них оставлена частица души. Они — плоды переживаний, размышлений и чувств.

А другие? Другие "пусть твердят, что пишет каждый в 19 лет".

**Т.ЦЕЛЕХОВИЧ,**
**студентка гр. РБ-23**
**филологического**
**факультета.**

***



**Светлана ЛАПИЦКАЯ**

СОДОМ И ГОМОРА

*Сердцу больно так иногда,*
*Когда прошлым его разбередишь.*
*Как живые встают города*
*С отпечатком вселенской трагедии.*

*Одичали в распутстве и гневе,*
*Память стерла заветы Отца,*
*Позабыв об Адаме и Еве,*
*Погубить вы решили себя.*

*Жили вы не спокойно и мудро*
*С мыслью праведною в душе,*
*С ночью темною спутали утро,*
*Не покинув греха и во сне.*

*И настигла вас кара небесная,*
*Разлилась из вулканов-котлов*
*Темнота молчаливой невестою,*
*Обняла вас во веки веков.*

Поэзия — это Прекрасно. Юность, любовь, первые стихи. Кто-то выражает свои чувства с помощью рифмы, кто-то иначе. Но главное, по-моему, чтобы поэзия жила в душе.

Если говорить о моем стихотворении, то здесь, наверное, все просто. Библия — Книга, которая существует вне времени. Она была, есть и будет, так как на протяжении веков несет в себе То, что заставляло великих людей браться за перо и склоняться над бумагой, часами стоять у холста с кистью и красками в руках и творить.



**Галина ГОЛОВАНОВА**

***

*У тебя есть мечта? —*
*Так борись за нее!*
*За нее и в огонь или в воду.*
*Ты вступай, не боясь, не страшась ничего*
*И Господь тебе в этом поможет.*
*А опустишь главу ,*
*Позабудешь про все —*
*Настоящих друзей потеряешь,*
*Обретешь ты врагов*
*В пелене ангелов...*
*Но надолго ль? Не знаю. Не знаю.*
*Если больно тебе,*
*Побори эту боль,*
*Пусть она тебя лучше боится.*
*Не давай над собой посмеяться другим,*
*Всегда помни, к чему ты стремишься.*

На написание стихотворения может повлиять многое: настроение, любимый человек, сама ситуация, место, где я нахожусь в данный момент, и многое другое.

Вообще, считаю, что люди забыли о поэзии. Большинство из них ссылаются на недостаток времени, другие говорят, что лучше посмотреть видео или послушать музыку, на худой конец — почитать детектив. Таким образом, на мой взгляд, поэзия угасает на глазах, потому что немало талантливых людей оказываются невостребованными обществом.

**Светлана СЕРГЕЕНКО**

МАРИЯ СТЮАРТ

*Вот мчишься ты стремительно и властно,*
*За поясом оружие держа,*
*Не знаешь и не видишь, что опасно*
*Было пустить на трон пажа.*

*Но и второй избранник королевы*
*Надежд ее не оправдал,*
*Он лишь всегда держался слева —*
*И страстных чувств ее не разделял.*

*О Боже, как страдала и молилась*
*Ее неудержимая душа,*
*Но то, чего она добилась,*
*На плахе смерти лишь нашла.*

*О да, ты истинный властитель,*
*Но не Шотландии родной.*
*Сердец влюбленных покровитель,*
*Гордись же ты своей рабой!*

*Она всю власть любви отдала,*
*Потом боролась до конца,*
*Сумев остаться королевой,*
*Достойной своего венца!*

На написание стихотворения меня может побудить все, что угодно: начиная с тихого дождливого вечера и заканчивая бурным впечатлением от только что прочитанной книги. В общем, поэзия для меня — это отражение моего настроения на бумаге. По-моему, отношение людей к поэзии, в целом, не изменилось, так как основной массе людей никогда не хватало времени на нее: житейские проблемы перевешивали этот интерес. Но это не значит, что люди относятся к поэзии отрицательно или равнодушно: я уверена, что каждый человек сможет вспомнить несколько строк из своего любимого стихотворения.

**Елена МАНУЙЛОВА**



***

*Роза...Черная Роза...*
*Я вижу ее вновь и вновь,*
*Закрою глаза — и угрозой*
*Покажется слово "Любовь".*

*Однажды Она покраснела,*
*Как будто опять ожила,*
*И горе с тоскою несмело*
*Решили покинуть меня.*

*Но в небе сгущалися тучи,*
*Порывистый ветер стонал,*
*И снова — длинные ноги,*
*И ты меня покидал.*

*Закрой же глаза и пусть Роза*
*Ярко цветет пред тобой.*
*И пусть не будет угрозы*
*Никогда за твоею спиной.*

Сидишь иногда одна... Вокруг тишина... И вдруг в воображении всплывают силуэты, картины природы; появляются мысли о самом нежном и возвышенном чувстве на земле. Пытаешься уловить самую яркую мысль, воссоздать, воплотить на бумаге занимающий тебя образ и чувствуешь себя самым счастливым и значимым человеком на земле, когда понимаешь, что это — Стихи.

"Век ядерной химии, электроники, компьютеров...". Люди, в большинстве своем, думают только о накоплении материальных благ, о месте "под солнцем". Поэтому, мне кажется, они меньше внимания уделяют своему внутреннему миру, созерцанию собственного "я". И, наверняка, читая стихи, они могут подумать: "Да-а-а, любовь. А какая любовь без денег? Или "Природа? Ну-ну, созерцайте, восхищайтесь ею, а работать-то кто будет?" и т.д. Правда, их тоже можно понять, но ведь можно же выкроить немного времени и "поверить в любовь" или научиться "любоваться природой".

**Наталья ТЕЛЕГИНА**

***



*Мне говорили:*
*"Не надо смеяться!*
*Рожицы корчить,*
*Весне улыбаться;*
*Подумаешь — май,*
*Ну, птицы поют,*
*Чирикают ночью*
*И спать не дают.*
*Познать надо слезы,*
*Унынье, печаль,*
*Будь посерьезней и поскучай.*
*Это полезно душе молодой,*
*Надо уметь казаться крутой,*
*Чтоб загрубела душа, как сапог,*
*Чтобы никто потревожить не мог.*
*Чтоб чувства уснули:*
*Они не нужны,*
*Ведь в этой жизни*
*Лишь деньги важны,*
*Раз они есть,*
*Значит, будешь царем,*
*А нет — тебя заживо мы погребем.*
*Зачем нам нужна твоя доброта?*
*Зачем этот май и эта весна?*
*Не нужно любви,*
*Не нужно хлопот.*
*Зачем на деревьях цветочки растут?*
*Ведь вредные дети итак их сорвут,*
*Не будет ни яблок, ни вишен, ни слив,*
*Чудак видно был, кто их посадил..."*

Что побуждает меня писать стихи? А что заставляет нас плакать, смеяться? Разве всегда есть причина нашему настроению? Для меня стихи, как слезы. Когда их выплачешь, то становится легче, или, наоборот, нависает тяжесть. Слезы высыхают, оставляя о себе кратковременную память в виде красных глаз. Они теряют свою актуальность. Стихи, наверное, тоже. Для меня поэзия, вообще, это способ создать себе любое настроение. Стихи некоторых авторов как будто говорят с тобой. Например, Ю.Друнина и В.Тушнова говорят стихами — это не расплывчатые образы, а разговор с собеседником или просто с его душой...

---

Увага: конкурс!

# АДКРЫЙЦЕ СВОЙ ТАЛЕНТ

З 17-га красавіка па 1-га мая ў нашым універсітэце будзе праводзіцца паэтычны конкурс "Насустрач цудоўнаму". На конкурсе будуць прадстаўлены 5 намінацый: любоўная лірыка; маладзёжна-студэнцкая тэматыка; вершы аб прыродзе; гумар; патрыятычныя вершы.

Прадстаўленыя на конкурс вершы будуць размешчаны на стэндах і выстаўлены ва ўсіх карпусах ГДУ. Кожны жадаючы зможа прачытаць гэтыя творы і выказаць сваё меркаванне ў спецыяльным сшытку водзываў. Усе меркаванні будуць улічаны, а выніковае рашэнне аб выбары пераможцаў будзе вынесена аўтарытэтным і кампетэнтным журы. У састаў апошняга ўвойдуць прадстаўнікі кіраўніцтва універсітэта, выкладчыкі філалагічнага факультэта, а таксама аргкамітэт.

Пераможцаў чакаюць граматы, прызы, а таксама публікацыя іх твораў, і ўсё гэта акрамя галоўнага — прызнання з боку чытачоў — студэнтаў і супрацоўнікаў ГДУ.

Удзельнічаць у конкурсе можа любы студэнт або супрацоўнік універсітэта. Прадстаўляць вершы можна і пад псеўданімам, але пры гэтым неабходна паведаміць у аргкамітэт свае дадзеныя: прозвішча, імя, імя па бацьку; факультэт; групу або месца працы, каб пасля мы мелі магчымасць узнагародзіць лепшых.

Удзельнікі конкурсу могуць прадстаўляць вершы ва ўсе намінацыі адначасова, да трох у кожную. Пішыце, калі ласка, выразна, або друкуйце свае творы.

Вершы прымаюцца да **18 красавіка.** Падавайце іх у галоўны корпус, п.4-10 або пішыце на e-mail: pkovalev@gsu.unibel.by.

Падарыце свой талент акружаючым. Бо мастацтва жыве толькі тады, калі яно запатрабавана!

Мы чакаем вас!

**Павел КАВАЛЕЎ,**
**студэнт 3 курса**
**фізічнага факультэта,**
**кіраўнік аргкамітэта.**

---

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:**

— філасофіі — заг.кафедры, дацэнта (3), асістэнта;
— педагогікі — заг.кафедры;
— беларускай мовы — прафесара;
— дыферэнцыяльных ураўненняў — дацэнта (2);
— ВМ і праграміравання — дацэнта;
— камерцыйнай дзейнасці і фінансаў — дацэнта (2);
— эканомікі і кіравання вытворчасцю — дацэнта (3);
— аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі — дацэнта;
— хіміі — заг.кафедры;
— батанікі і фізіялогіі раслін — дацэнта (2);
— заалогіі і аховы прыроды — дацэнта;
— экалогіі — дацэнта;
— крымінальнага права і працэсу — асістэнта;
— рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства — прафесара, дацэнта, асістэнта;
— рускай літаратуры — асістэнта;
— псіхалогіі — дацэнта (2);
— французскай мовы — выкладчыка (2);
— радыёфізікі і электронікі — ст.выкладчыка (2);
— тэорыі і методыкі фізічнай культуры — ст.выкладчыка, выкладчыка (2);
— тэорыі і гісторыі дзяржавы і права (асістэнта);
— тэорыі і практыкі англійскай мовы — выкладчыка (2);
— фізвыхавання і спорту — ст.выкладчыка, выкладчыка;
— лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту — выкладчыка;
— усеагульнай гісторыі — ст.выкладчыка;
— беларускай літаратуры — асістэнта;
— матэматычнага аналізу — асістэнта;
— геалогіі і разведкі карысных выкапняў — асістэнта, дацэнта, прафесара.

**Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.**

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

---

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.
Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.
Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар
Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 202.
Падпісана да друку 11.04.2000 г.